АЛІМПІЙЦАМ ВЫПЛАЧАНЫ ПРЭМІЯЛЬНЫЯ

Беларускім спартсменам, якія заваявалі медалі на XXII зімовых Алімпійскіх гульнях 2014 года ў Сочы, выплацілі прэміяльныя. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада.

«Сёння даручэнне кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі выканана — прызавыя пераведзены на карт-рахункі спартсменаў, а таксама іх трэнераў», — сказалі ў прэс-службе.

Сродкі пералічаны ў замежнай валюце. Сумы прызоў спартсменам, а таксама ўзнагароды трэнерам, якія забяспечылі іх падрыхтоўку, вызначаны Указам Прэзідэнта № 333 ад 25 чэрвеня 2010 года «Аб некаторых мерах па падрыхтоўцы беларускіх спартсменаў да Алімпійскіх, Паралімпійскіх і Дэфлімпійскіх гульняў».

НАЗНАЧАНЫ НАМЕСНІК КАМАНДУЮЧАГА ВОЙСКАМІ ЗАК

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сваім указам назначыў палкоўніка Віктара Хрэніна намеснікам камандуючага войскамі Заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

ЗА ЎЧЫНЕННЕ ПРАВІННАСЦЯЎ

Прэзідэнт Беларусі вызваліў генерал-маёра міліцыі Івана Саўчыца ад пасады начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама за ўчыненне правіннасцяў, якія дыскрэдытуюць званне супрацоўніка органаў унутраных спраў, і звольніў яго са службы ў органах унутраных спраў у сувязі з сістэматычным невыкананнем умоў кантракта. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, адпаведны ўказ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 28 лютага.

БУДАЎНІЦТВА ДРУГОЙ КАЛЬЦАВОЙ АЎТАДАРОГІ ВАКОЛ МІНСКА БУДЗЕ ПРАДОЎЖАНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Да таго ж, на думку Прэзідэнта, стварэнне «другога кальца» станоўча паўплывае на экалагічную сітуацыю ў горадзе. «Мы неадкладна павінны пачаць работы па будаўніцтве другой кальцавой дарогі вакол Мінска, каб Мінск не задыхнуўся ў гэтым брудзе, каб 2 млн чалавек, чвярць насельніцтва нашай краіны, не адчувалі гэтай праблемы. Трэба мець на ўвазе, што ад гэтага і ўсе хваробы. І нам давядзецца плаціць шалёныя грошы для таго, каб лячыць людзей. Гэта таксама не трэба забываць, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Галоўнае тое, што мы атрымаем мінчан, калі ў бліжэйшыя гады не пабудуем гэту дарогу».

Як далажыў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч, у агульнай колькасці працягласць дарогі складае 85 км, з якіх на першым этапе плануецца пабудаваць 44 км — участак ад Астрашыцкага Гарадка да Аксакаўшчыны. Паводле слоў прэм'ер-міністра, за выключэннем фінансавага боку пытання, падстаў, каб не будаваць аўтадарогу, няма.

Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым адзначыў, што з улікам ужо існуючых участкаў дарогі будаўніцтва будзе не такім фінансава затратным. «А калі ўзяць усе пытанні пад кантроль і эканоміць грошы, то мы яе можам пабудаваць, — лічыць Прэзідэнт. — Цяжка будзе заўсёды, грошай заўсёды не хапае, і пры гэтым я прашу ўлічыць: вы помніце, як абуралася нейкая частка насельніцтва ў сувязі з тым, што мы збіраем транспартны збор. Майце на ўвазе — усе гэтыя грошы павінны пайсці на дарогі. Ні на якія іншыя патрэбы — толькі на дарогі! У адваротным выпадку крытыка народа будзе абгрунтаванай. За гэта ўрад адкажа. Усе грошы, сабраныя ад гэтага транспартнага падатку, павінны быць укладзены ў дарогі».

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што, выконваючы даручэнне кіраўніка дзяржавы, сродкі канцэнтраваліся на тое, каб зрабіць максімальна добрую і камфортную сувязь з абласнымі цэнтрамі і іншымі буйнымі гарадамі. За тры гады было пабудавана 344 км дарог рэспубліканскага значэння выдатнай якасці, пры гэтым за ўсю папярэднюю пяцігодку — 328 км. У бягучым годзе плануецца ўвесці яшчэ 104 км дарог.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што неабходна прывесці ў належны стан і трасы ад Мінска ў напрамку Гродна і Віцебска, па прыкладу таго, як гэта было зроблена ў напрамку іншых абласных цэнтраў, а таксама беларускі ўчастак дарогі Адэса — Санкт-Пецярбург.

Што датычыцца другой кальцавой аўтадарогі вакол Мінска, то Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што яна праектуецца па першай катэгорыі, што прадугледжвае інтэнсіўнасць руху ад 10 тыс. аўтамабіляў у дзень. Напрыклад, існуючая кальцавая аўтадарога сёння прапускае каля 90 тыс. аўтамабіляў, гэта значыць нагрузка на яе ў 9 разоў перавышае мінімальную адзнаку для першай катэгорыі дарог.

Паводле слоў міністра транспарту і камунікацый Анатоля Сівака, работы па стварэнні «другога кальца» пачаты, аднак да гэтага часу вяліся недастатковымі тэмпамі.

У ходзе даклада была вызначана стратэгія будаўніцтва аўтадарогі на гэты і наступныя гады, а таксама ўчасткі, дзе работы будуць весціся інтэнсіўна. Акрамя таго, ішла размова аб крыніцах фінансавання, прыцягнення ў тым ліку прыватных сродкаў з дарожнага збору. З 1 сакавіка будзе прадоўжана будаўніцтва дарогі на тых участках, дзе ўжо былі пачаты падрыхтоўчыя работы, і ў 2014 годзе плануецца ўвесці першыя 20 км другой кальцавой аўтадарогі.

КОРАТКА

Пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў пройдзе ў Маскве 11 сакавіка.

Масленічныя кірмашы пройдуць у Мінску 1-2 сакавіка. Самы вялікі кірмаш пройдзе 1 сакавіка каля Палаца спорту на праспекце Пераможцаў. Сваю прадукцыю прадставяць ААТ «Белрыба», Мінскі камбінат хлебапрадуктаў, ААТ «Камунарка», УП «Мінскі мясакамбінат», КУП «Мінскхлебпрам» і іншыя.

Беларусь у 2013 годзе наведалі 136,8 тыс. чалавек, што на 15,2 працэнта больш, чым у 2012 годзе.

СЛОВАМ І СПРАВАЙ

Жывыя стасункі ў ідэалагічнай рабоце надзвычай важныя

У Брэсце прайшоў семінар ідэалагічнага актыву «Асаблівасці ідэалагічнай работы ў сучасных умовах»

Падчас наведвання грамадскай прыёмнай абласной арганізацыі РГА «Белая Русь», першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ адзначыў, што грамадская прыёмная аказалася запатрабаванай формай работы з насельніцтвам. Старшыня абласной арганізацыі «Белая Русь» Пётр Пойта расказаў, з якімі пытаннямі найчасцей сюды прыходзяць людзі. З пачатку года ў грамадскую прыёмную, дарэчы, паступіла 28 зваротаў грамадзян.

Фота БЕЛТА.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар і Аляксандр Радзькоў сустрэліся з кадравым рэзервам аблвыканкама. З маладымі людзьмі кіраўнік «Белай Русі» ўжо сустракаўся на адным з семінараў у 2011 годзе і з задавальненнем адзначыў, што яны даволі значна выраслі прафесійна.

Падчас сустрэчы з насельніцтвам у ЖЭС-10 Брэста праблемы ўзніміліся розныя, былі і даволі вострыя. Усе ўдзельнікі дыялогу атрымалі кампетэнтныя адказы.

На задачах ідэалагічнага актыву ў сучасных умовах акцэнтаваў увагу Канстанцін Сумар падчас пленарнага пасяджэння. «Людзі нармальна ўспрымаюць інфармацыю аб тым, чаму не вырашаюцца асобныя праблемы, трэба толькі аргументавана і своечасова тлумачыць ім. З людзьмі трэба гаварыць», — заўважыў губернатар Брэстчыны. Кіраўнік вобласці лічыць вельмі важным выкарыстанне інтэрактыўных формаў работы. Напрыклад, з дапамогай інтэрнэту цяпер можна правесці вучобу кадраў, не адрываючы іх ад вытворчасці на курсы павышэння кваліфікацыі.

Больш за тое, проста падчас семінару прайшоў відэапрыём грамадзян губернатарам. У студыі сваіх гарадоў прыйшлі жыхары Маларыты, Пінска, Баранавіч. Прагучалі пытанні аб пагаршэнні экалагічнай абстаноўкі ў Маларыце, выкліканай ростам патоку велікагрузнага транспарту, аб далейшым лёсе маленькай бібліятэкі ў Пінску, а таксама жыллёвае пытанне.

«Наша слова павінна падмацоўвацца справай», — не раз прагучала ў ходзе семінара ідэолагаў. Выступоўцы гаварылі аб неабходнасці стварэння здаровай, кансалідуючай атмасферы ў працоўных калектывах. Пра патрыятызм як кансалідуючую сілу грамадства гаварыў таксама старшыня Брэсцкага аблвыканкама ў кантэксце апошніх публікацый вакол Брэсцкай крэпасці, калі амерыканскія журналісты дазволілі сабе непрыстойна гумарыць наконт помнікаў: «Людзі прыходзілі ў крэпасць, пісалі ў газеты, на сайты, адгукнуліся грамадзяне розных краін, хоць ніхто нікога не прасіў аб гэтым. І мы разам адстаялі паважлівую памяць пра нашу святыню».

Вынікі семінара падвёў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў. Аляксандр Міхайлавіч падкрэсліў: «Сёння мы яшчэ раз упэўніліся, што жывыя стасункі ў ідэалагічнай рабоце надзвычай важныя. Вы прыедзеце ў свае раёны, раскажаце, што чулі, пра што гаварылі з калегамі. Магчыма, з нечым не пагодзіцеся. І гэта будзе сумленна. Але ваш шчыры роздум і дыскусія з аднадумцамі паспрыяюць пошуку адзіна правільнага рашэння».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

СВАІМІ ДУМКАМІ ПАДЗЯЛІЛІСЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ СЕМІНАРУ

Марыя ГЛАДУН, старшыня Маскоўскай раённай арганізацыі РГА «Белая Русь» г. Брэста:

— Мерапрыемства можна разглядаць у сістэме агульнай работы з ідэалагічным актывам. Падобныя мерапрыемствы каштоўныя тым, што мы можам атрымаць інфармацыю з першых вуснаў, паслухаць калег, падзяліцца вопытам. На працягу дня была магчымасць з таварышамі па грамадскім аб'яднанні абмеркаваць будучую выбарчую кампанію. У нашым раёне, напрыклад, 86 выбарчых участкаў. У складзе кожнай камісіі ёсць прадстаўнікі «Белай Русі». Пры гэтым абсалютную большасць з іх вылучылі працоўныя калектывы, што гаворыць аб аўтарытэце членаў аб'яднання. Акрамя таго, на кожны ўчастак мы намераны накіраваць сваіх назіральнікаў.

Мікалай АНТАНОЎСКІ, галоўны рэдактар Пружанскай газеты «Раённыя будні»:

— Прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі пабывалі ў рэдакцыях абласных газет, на тэлерадыёкампаніі. Калегі паказалі даволі цікавыя напрацоўкі ў плане падачы інфармацыі, ажыццяўленні медыйных праектаў.

Аляксандр ЗАЗУЛЯ, старшыня Кобрынскага райвыканкама:

— У нашым жыцці вельмі важна не падмяняць жывую работу з людзьмі яе імітацыяй. Прамы дыялог з працаўнікамі, асабліва на сяле, дае вельмі важкія вынікі, здымае напружанасць, паскарае вырашэнне праблем. Я падзяліўся гэтымі поглядамі з калегамі і знайшоў аднадумцаў.

БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ЗАХАВАННІ УКРАІНЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ І ТЭРЫТАРЫЯЛЬНА ЦЭЛАСНАЙ

Беларусь зацікаўлена ў тым, каб Украіна заставалася суверэннай, незалежнай, тэрытарыяльна цэласнай дзяржавай. Аб гэтым заявіў журналістам міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей па выніках сустрэчы 27 лютага ў Рызе з кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Латвійскай Рэспублікі Эдгарсам Рынкевічсам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе МЗС.

Уладзімір Макей падкрэсліў: «Мы негатыўна ацэньваем тое, што адбываецца цяпер ва Украіне. Украіна — наш паўднёвы сусед, у нас у мінулым годзе тавараабарот быў $7 млрд, у пазамінулым — $8 млрд. Мы цесна звязаны гандлёва-эканамічнымі сувязямі і гаворым практычна на адной мове — разумеем адзін аднаго, калі размаўляем на ўкраінскай або беларускай мовах, нашы народы абсалютна блізкія. Таму мы ўспрымаем тое, што адбываецца ва Украіне, я сказаў бы, як трагедыю і, зразумела, шкадуем аб ахвярах ва Украіне. Мы абмяркоўвалі гэта пытанне. Мы зацікаўлены ў тым, каб Украіна засталася суверэннай, незалежнай, тэрытарыяльна цэласнай дзяржавай».

Ён прадоўжыў: «Не варта, напэўна, цяпер вяртацца ў мінулае і гаварыць аб тым, хто мае рацыю, а хто вінаваты, але я лічу, што на нейкім этапе — да Вільнюскага саміту «Усходняга партнёрства» або адразу пасля яго — маглі б быць зроблены адпаведныя крокі, якія не дапусцілі б гэтай трагедыі. Гэта датычыцца ўсіх бакоў, уключаных у гэты працэс. Але адбылося тое, што адбылося. Цяпер, як нам здаецца, самае галоўнае — аднавіць стабільнасць, не дапусціць далейшага кровапраліцця, забяспечыць функцыянаванне адпаведных органаў улады, якія павінны быць легітымнымі. Самае важнае — захаваць тэрытарыяльную цэласнасць, суверэнітэт і незалежнасць Украіны». Уладзімір Макей адзначыў, што Беларусь зыходзіць з таго падыходу, што Украіна — вельмі важны яе партнёр.

ПАРУШЫЎ — ПЛАЦІ БОЛЬШ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дапоўнены пералік ільгот па падатку на нерухомасць: сёлета з 1 студзеня не абкладаюцца ім капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, машына-месцы, якія належаць на праве ўласнасці грамадскаму аб'яднанню «Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь».

Зямлю трэба паважаць

Заканадаўства па зямельным падатку сёлета істотна не змянілася, але... Варта адзначыць, што стаўкі зямельнага падатку, устаноўленыя ў беларускіх рублях, у 2014 годзе павялічаны ў сярэднім на 12,7%. У прыватнасці, цяпер падраслі стаўкі зямельнага падатку ў дачыненні да ўчасткаў, якія выкарыстоўваюцца для арганізацыі аўтамабільных рынкаў, з 0,55% да 3% ад кадастравага кошту.

З пачатку года былі праіндэксаваны стаўкі зямельнага падатку на землі сельскагаспадарчага прызначэння. Эксперты праіндэксавалі стаўку па такіх «вясковых» землях, якія сёння занятыя капітальнымі будынкамі і іншымі аб'ектамі. З 1 студзеня яна складае 5 690 рублёў за 1 гектар.

Шмат пытанняў узнікала па ўчастках, якія выкарыстоўваліся не ў адпаведнасці з мэтай іх прадастаўлення. Падобных парушальнікаў землеўпарадкавальныя службы мясцовых выканаўчых камітэтаў цяпер пачнуць караць рублём шматкратных падаткаў. Сёлета на зямельныя ўчасткі, якія выкарыстоўваюцца не па мэтавым прызначэнні, прымяняюцца стаўкі зямельнага падатку па фактычным функцыянальным выкарыстанні, павялічаныя на каэфіцыент 10.

Пенсіянеры па ўзросце, інваліды I і II групы і іншыя непрацаздольныя фізічныя асобы маюць права на льготы па зямельным падатку ў дачыненні да зямельных участкаў, якія размешчаны не па месцы іх жыхарства і прадастаўлены такім асобам для гаражнага будаўніцтва. Па гэтым пытанні ўдакладняецца адзін слушны момант. Так, зямельным падаткам абкладаецца ўся плошча зямельнага ўчастка, якая прадстаўлена арганізацыі для будаўніцтва і эксплуатацыі гаражоў. Пры гэтым арганізацыя вызваляецца ад выплаты зямельнага падатку ў частцы плошчы зямель, якая прыходзіцца на фізічных асобільготнікаў. Атрымліваецца, што ад зямельнага падатку будзе вызваляцца не толькі плошча зямельнага ўчастка пад гаражамі, якія належаць такім фізічным асобам, але і плошча, якая прыходзіцца на месцы агульнага карыстання.

Экападатак стаў больш зразумелым

Падатковыя службы сур'ёзна спрасцілі алгарытм вылічэння экалагічнага падатку. Асаблівая ўвага нададзена ўдасканаленню аднаго з плацяжоў, якія ўваходзяць у склад экалагічнага падатку, — экалагічнаму падатку за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра. Цяпер падатковая база экалагічнага падатку вызначаецца праз фактычныя аб'ёмы выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад стацыянарных крыніц, калі апошнія ўказаны ў дазволах на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра або комплексных прыродаахоўных дазволах.

Такім чынам, цяпер пад аб'ект абкладання экалагічным падаткам практычна падпадаюць толькі тыя выкіды, што ўтвараюцца стацыянарнымі крыніцамі, у дачыненні да якіх атрыманы дазволы на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра або якія пазначаны ў комплексных прыродаахоўных дазволах.

Выкіды забруджвальных рэчываў, якія ажыццяўляюцца нестацыянарнымі крыніцамі або стацыянарнымі крыніцамі, па якіх не патрабуецца атрымання адпаведнага дазволу, экалагічным падаткам не абкладаюцца. У новай рэдакцыі спецыялісты выключылі паніжальны каэфіцыент 0,5 да ставак экалагічнага падатку, які ўжываўся пры разліку падатку на выкіды, якія ўтвараліся пры згаранні біягазу і біяпаліва.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

НЕЗАКОННА ЗНЯТЫЯ СРОДКІ БАНК ВЕРНЕ НА ПРАЦЯГУ 30 ДЗЁН?

Нацыянальны банк рэкамендаваў банкам у выпадках спісання грашовых сродкаў без згоды трымальніка банкаўскай аплатнай карткі і адсутнасці пры гэтым у банка інфармацыі аб махлярстве з боку кліента кампенсаваць грашовыя сродкі на працягу 30 дзён з дня атрымання заявы кліента пры выкарыстанні банкаўскай карткі на тэрыторыі Беларусі і на працягу 60 дзён пры правядзенні аперацыі за межамі Беларусі. Пра гэта паведаміла **начальнік упраўлення развіцця банкаўскіх плацежных картак і электронных грошай Нацыянальнага банка Беларусі Людміла СТЭФАНОВІЧ.**

«Гэта вельмі вялікі крок наперад, тое, пра што заўсёды казалі фізічныя асобы, абмяркоўвалі банкі і праваахоўныя галіны — укараненне прынцыпу нулявой адказнасці», — падкрэсліла яна. Такое рашэнне было прынята Нацбанкам з улікам зваротаў грамадзян і, перш за ўсё, у мэтах захавання даверу насельніцтва да банкаўскай сістэмы, таго, што ўжо дасягнута ў сферы безнаяўных разлікаў. Да таго ж гэта прадыктавана міжнароднай практыкай.

Акрамя таго, нагадаем, што Нацбанк распрацаваў праект нарматыўнага дакумента, якім прапануецца ўстанавіць для насельніцтва гранічную суму плацяжу наяўнымі грашовымі сродкамі на ўзроўні не большым за 1 тысячу базавых велічынь (13,5 тысячы долараў). «Мы лічым, што гэта аптымальная велічыня, хоць некаторыя міністэрствы і ведамствы лічаць, што яе трэба яшчэ змяншаць», — сказала Людміла Стэфановіч.

Паводле інфармацыі БЕЛТА.

АЛЕКСАНДРЫЯ ЗНОЎ ЗБЯРЭ СЯБРОЎ

Сёлета купальскае святкаванне пройдзе пад дэвізам «Дняпро — рака дружбы»

Свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») у аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна адбудзецца сёлета 5-6 ліпеня. Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада па выніках пасяджэння пастаянна дзейнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні свята, якое прайшло пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Тозіка.

У ходзе пасяджэння быў разгледжаны шэраг пытанняў, звязаных з падрыхтоўкай мерапрыемства. У прыватнасці, канцэпцыя правядзення свята, яго праграма, пытанні па арганізацыі работы гандлёвых выстаў і ўдзелу замежных гасцей.

Мерапрыемствы свята пройдуць пад дэвізам «Дняпро — рака дружбы». Пачнуцца яны 5 ліпеня адкрыццём выставы-кірмашу народных майстроў «Вялікі Александрыйскі кірмаш», падчас якога запланавана арганізацыя міні-святаў «Сялянскі двор», «Глушанскі хутарок», «Залатая саломка», «Беларускі фарфор» і інш. Пройдуць таксама фестывалі піва, лёну, беларускай бульбы.

Будзе значна пашыраны колькасны склад творчых дэлегацый краін—удзельніц святочных мерапрыемстваў. Госці прымуць удзел у выставах (бізнес-перамовах), арганізатарам якіх выступіць Беларуская гандлёва-прамысловая палата. Адбудзецца прэзентацыя слуцкага пояса і сувенірнай прадукцыі з гэтым таварным знакам.

Па выніках пасяджэння арганізацыйнага камітэта зацверджаны план мерапрыемстваў па яго падрыхтоўцы, дадзены адпаведныя даручэнні органам дзяржкіравання і арганізацыям па аказанні садзейнічання ў правядзенні мерапрыемстваў свята на высокім арганізацыйным і творчым узроўні.

НА «ТЭЛЕФОННАГА ТЭРАРЫСТА» ЗАВЯЛІ СПРАВУ

У дачыненні да аўтара sms-паведамлення, праз якога ў сераду тры гадзіны не працавала мінскае метро, распачалі крымінальную справу. Ён абвінавачваецца ў заведама лжывым паведамленні пра тэракт.

Пра магчымую пагрозу тэракта супрацоўнікі аховы метрапалітэна даведаліся ад пасажыркі. Апошняя выпадкова прачытала sms-ку, якую набраў на сваім мабільным тэлефоне мужчына, што стаяў побач з ёй у вагоне. Дзяўчына сцвярджала, што малады чалавек збіраецца падарваць метро.

Метро тут жа закрылі, а для таго, каб зменшыць нязручнасці пасажыраў, выдзелілі дадатковыя тралейбусы, трамваі і аўтобусы.

— Інфармацыя аб існаванні выбуховага прыстасавання, якое магло б пагражаць жыццю і здароўю людзей, не пацвердзілася, — распавёў афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Мінску Аляксандр Герасімаў. — Праз тры гадзіны, дзякуючы фотаздымкам з камер відэаназірання, затрымалі аўтара паведамлення.

Ім аказаўся 35-гадовы жыхар Мінскай вобласці, ураджэнец Караганды. Пакуль што вядома толькі тое, што жартаўлівае паведамленне з пагрозай выбуху ён адправіў сваёй дзяўчыне. Падрабязней пра матывы падазраванага следчыя паабяцалі паведаміць пазней.

Варта дадаць, што жартаўніку, згодна з заканадаўствам, пагражае максімальна да пяці гадоў турмы. Акрамя таго, яму, хутчэй за ўсё, давядзецца кампенсаваць урон, які панеслі метрапалітэн і Мінсктранс з-за яго розыгрышу.

Надзея ПАЎЛАВА.

■ 1 сакавіка — Міжнародны дзень барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам

СМЕРЦЬ АД СПАЙСУ

Колькасць хворых на наркаманію ў краіне штогод расце. З 1987 года яна вырасла ў 33 разы. У сталіцы — у 56 разоў. Ужываецца, галоўным чынам, опій, а таксама канабіс, гераін, псіхастымулятары і інш. Летась фактычна штотыдзень з'яўляўся новы наркотык. Атрымлівалася, што да моманту ўключэння яго ў спіс забароненых рэчываў незнаёмы наркотык прадаваўся беспакарана. Каля 50 працэнтаў наркаспажыўцоў маюць сярэднюю адукацыю, 20 працэнтаў — няпоўную сярэднюю. У паловы — судзімасць.

— Акрамя таго, што наркаманія прыводзіць да фізічнай, маральнай і сацыяльнай дэградацыі асобы, яна штурхае людзей, якія страцілі сябе, на злачынствы, — кажа **загадчык сектара наркалогіі РНПЦ псіхічнага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Уладзімір МАКСІМЧУК.** — Летась зафіксавана звыш 6 тысяч злачынстваў, звязаных з наркотыкамі. Гэта і збыт наркатычных сродкаў, і арганізацыя прытонаў, схіленне да ўжывання наркарэчываў, крадзеж наркотыкаў. Праблема распаўсюджвання наркаманіі займае не апошняе месца і ў ліку прычын высокай смяротнасці, нізкай нараджальнасці, нізкай працягласці жыцця. У Беларусі штогод ад перадазіроўкі наркотыкаў памірае да 100 чалавек...

У апошнія гады «модным» сярод моладзі стала ўжыванне спайсаў — курыльных сумесяў, якія апрацоўваюцца тым ці іншым наркатычным рэчывам. **Ужыванне спайсу прыводзіць літаральна да імгненнага развіцця залежнасці.** Псіхалагічная залежнасць з'яўляецца пасля аднаго-двух разоў ужывання, фізічная — праз 2-3 месяцы. **Летась па дапамогу пасля ўжывання сінтэтычных псіхатропаў, якія ўваходзяць у склад курыльных сумесяў, звярнуліся каля 700 чалавек. 6 чалавек загінулі. З пачатку гэтага года ўжо зафіксавана каля 100 зваротаў і 2 лятальныя зыходы.**

Так, 14 лютага ў пасёлку Прывольны Мінскага раёна кампанія хлопцаў набыла спайс праз інтэрнэт. Эфект уздзеяння на арганізм аднаго са спажыўцоў прывёў да трагедыі. Малады чалавек устаў на падаконнік, разбіў рукамі шклопакет, з-за чаго парэзаў абедзве рукі, шыю, спіну і да прыезду «хуткай дапамогі» загінуў ад страты крыві. 17 лютага ў машыне «хуткай» памёр 9-класнік адной са спартыўных школ Мінска. У бессвядомым стане яго забралі з кватэры жылога шматпавярховага дома ў мікрараёне Серабранка з дыягназам «перадазіроўка наркотыкамі». Смерць наступіла ў выніку ўжывання «сінтэтыкі», набытай праз інтэрнэт.

Наогул, як правіла, падлеткі, які вырашаюць паспрабаваць наркотык, знаёмяцца з даволі вялікай колькасцю псіхаактыўных рэчываў, што на мове спецыялістаў называецца полінаркатызмам. Паступова фарміруецца перавага ў дачыненні да нейкага аднаго наркотыку. З гэтага моманту ўжыванне становіцца рэгулярным, і чалавек усё жыццё падпарадкоўваецца патрэбе рэгулярнага паўтору інтаксікацыі.

Наркатычная залежнасць больш выражаная ў параўнанні з алкагольнай, хутчэй прыводзіць да поўнага спустошвання, канфліктаў у сям'і, на вучобе і працы. Хворыя імкліва дэградуюць. Паколькі паступова ўзрастае патрэба ў павелічэнні дозы, то аднойчы нарказалежны рызыкуе страціць кантроль і загінуць ад перадазіроўкі.

Некаторыя ўскосныя знешнія прыкметы ўжывання наркотыкаў (у наркаманаў са стажам):

❍ Заўсёды доўгія рукавы адзення. Ненатуральна вузкія або шырокія зрэнкі незалежна ад асвятлення. Неахайны знешні выгляд. Ацёкі рук. Разбураныя зубы. Сутулая постаць. «Расцягнутае» маўленне. Запаволеныя рухі. Раздражнёнасць і рэзкасць пры адказе на пытанні.

❍ Хуткія, частыя, не адпаведныя сітуацыі змены настрою.

❍ Сляды ад ін'екцыйнага ўвядзення наркотыкаў — на любых частках цела, не выключаючы скуру галавы. Часта сляды ўколаў зліваюцца ў шчыльныя сіняватабарвовыя плямы па ходзе вен.

❍ Зніжэнне паспяховасці ў вучобе, прагулы заняткаў. Павелічэнне часу «гулянняў».

❍ Рост фінансавых патрэб — знікненне грошай з бацькоўскіх кашалькоў, каштоўных рэчаў з дома.

❍ З'яўленне новых «падазроных» сяброў.

Навошта?

Ужыванне наркотыкаў дае эфект стану лёгкага «палёту», галавакружэння, добрага настрою, бяспечнасці, галюцынацый. Матывацыяй можа стаць пасіўнае перайманне паводзін «сяброў», што ўласціва псіхічна няспелым, інфантыльным асобам.

Як вынік...

...пагаршэнне памяці, падаўленне волі, зніжэнне інтэлектуальных здольнасцяў, з'яўленне агрэсіі, цяжкія паражэнні ўнутраных органаў, у тым ліку галаўнога мозга.

Калі абарваць прыём

Сіндром адмены — гэта падаўлены настрой, раздражняльнасць, галаўны боль, сутаргі, пашыраныя зрэнкі, дрыжанне пальцаў, павек, языка, павышаны сухажыльны рэфлекс, рухальнае ўзбуджэнне, непрыемныя адчуванні ва ўсіх частках цела. Сітуацыя можа пагаршацца цягам тыдня, потым паступова пайсці на спад. На больш працяглы час застаюцца бяссонніца, прыступы незадаволенасці, злосці, тугі.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

ЧАРГОВАЯ АХВЯРА

У сталіцы чарговай ахвярай «маркі» — прамочанага псіхатропным рэчывам аркуша паперы, які выступае ў якасці гатовай да ўжывання дозы, — стаў 24-гадовы мінчанін.

Паводле інфармацыі прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама, малады чалавек адпачываў у кампаніі двух прыяцеляў і дзяўчыны. Адзін з прысутных, які працуе ў IT-кампаніі, прапанаваў замовіць па інтэрнэце партыю «марак», якія дылеры пазіцыяніруюць як «легальныя». Спажылі іх усе чацвёра па дарозе на кватэру, дзе праходзіла вечарына. Неўзабаве праграмісту, які купіў псіхатроп, стала дрэнна, і ён у неадэкватным стане выбег на вуліцу. Следам за ім пабеглі і адзін з хлопцаў, і дзяўчына, якія тут жа выклікалі таварышу брыгаду хуткай медыцынскай дапамогі. Калі парачка вярнулася назад, іх 24-гадовы сябар, што застаўся ў кватэры, ужо не падаваў прыкмет жыцця. Як высветлілася, малады чалавек памёр ад перадазіроўкі. Пацярпелы, якому выклікалі «хуткую», зараз знаходзіцца ў РНПЦ псіхічнага здароўя ў Навінках.

Праваахоўнікі нагадваюць, што ў Беларусі няма легальных наркотыкаў і псіхатропаў. А самі «спайсы» ўсё часцей прыводзяць да летальнага зыходу, у лепшым выпадку — да бальнічнага ложка, у тым ліку і ў псіхіятрычнай бальніцы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ОБЪЯВЛЕНИЕ

28 марта 2014 года по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176 (конференц-зал, 4 этаж главного корпуса)
СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОТЧЕТНО-ВЫБОРНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Камволь»

Начало собрания в 10.00.
Регистрация участников собрания с 9.00 до 9.45.

Повестка дня:

1. Отчет о финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2013 году и основных направлениях деятельности Общества на 2014 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2013 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии и заключение по бухгалтерскому балансу, отчет о прибылях и убытках и годовому отчету Общества.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества за 2013 год.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2013 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2014 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Маяковского, 176, тел. 223-14-20.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2014 года.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

УНП 100074393

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк»
с 03.03.2014 устанавливает процентную ставку по вновь принимаемым срочным банковским вкладам в белорусских рублях:

- **«Приоритет»** – в размере 41% годовых;
- **«Гарантированный доход»**:
  - сроком на 15 дней – в размере 32% годовых;
  - сроком на 35 дней – в размере 40% годовых.

*(По ранее принятым на указанные сроки вкладам **«Гарантированный доход»** установленный размер процентной ставки применяется с даты автоматического перезаключения на новый срок начиная с 03.03.2014)*;

- **«Интернет-депозит-Презент»** – основной доход в размере 40% годовых.
- **«Четыре сезона»** – основной доход в размере 41% годовых.

С 03.03.2014 установлена процентная ставка по вновь оформляемым сберегательным сертификатам со сроком обращения 1 месяц – в размере 40% годовых, 2 месяца – в размере 41% годовых.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)

Свидетельство о государственной регистрации, печать круглая, штампы ИП БЕЛОГО Вадима Александровича, УНП 491031307 **считать недействительными в связи с утерей.**